





# Купальская этнафонія ля вытоку Менкі



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

*«Сягоння*
*ў нас Купала!*
*Ня дзеўка*
*агонь клала.*
*Сам Бог*
*агонь раскладаў,*
*Усіх святых*
*да сябе зваў...»*

ДЗЯКУЮЧЫ Купаллю зноў ажыла маўклівая музейная прастора! І традыцыйная рэгіянальная архітэктура, сабраная на схіле Менкі, стала раптам «жывым» Палессем, Паазер'ем, Падняпроўем... Над чаротавымі стрэхамі беларускіх хат і «беспрацоўнымі» ветракамі, цэрквачкамі, карчмою, пунькамі і свірнамі, над полем квітнеючай грэчкі і яшчэ маладымі прысадамі ліп і дубкоў звонкім рознагалоссем ляцелі летнія песні. Нібы птушкі, якіх доўга трымалі ў клетцы і нарэшце адпусцілі на волю. Фарбы дзявочых строяў і вяночкі з водарных сакавітых кветак сведчылі, што прырода цяпер у самым росквіце і зямля наша не абдзелена прыгажосцю. Здавалася, усё злілося ў гэтае імгненне ў стракатым песенным карагодзе. Толькі спецыяліст і мог адрозніць этнафонію — манеру традыцыйнага рэгіянальнага песеннага выканання і ўлавіць тонкія тэмбравыя адценні абрадавага гучання. Бо манеры выканання купальскіх песень Магілёўшчыны і Брэстчыны, насамрэч, розныя!

*«Ой, рана на Йвана!*
*Дзе Купала начавала?*
*Начавала ў чыстым полі.*
*У чыстым полі, густым жыце...»*

Гэтыя радкі песні, вядомай нам з рэпертуару мулявінскіх «Песняроў», былі знойдзены ў жывым выкананні на так званым Падняпроўі — Магілёўшчыне.

25 ліпеня (па старым стылі), якраз у дзень Івана Купалы, у музеі архітэктуры і побыту праводзілася абрадавае святкаванне з выкарыстаннем песеннага матэрыялу Брэсцкага Палесся і Магілёўскага Падняпроўя. Ладзілі яго гурты спецыялізацыі этнафоназнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва. Сярод іх былі добра вядомыя ўжо студэнцкія калектывы: «Раме», «Вяснянка», «Этнасуполка», гурты сталічных цэнтраў народнай творчасці «Сунічка» і «Верас».

— Вельмі важна, што рэгіянальныя формы Купалля мы паказваем у месцы, дзе сабрана і рэгіянальная аўтэнтычная архітэктура, — кажа выкладчык кафедры этналогіі і фальклору Таццяна Пладунова. — Такое спалучэнне этнаграфіі і фальклору дае добры плён у падрыхтоўцы спецыялістаў па захаванні народнай песенна-абрадавай спадчыны. Яны, калі раз'едуцца працаваць па рэгіёнах, будуць не толькі не блытаць розныя манеры выканання абрадавых песень, але і прытрымлівацца сваіх рэгіянальных манер выканання.

МУЗЕЙ даўно стаў пляцоўкай «прэзентацыі» творчых прац і этнафанічных праграм студэнтаў. Вось і гэтае «Купалле» падрыхтавалі ўдзельніцы «Вяснянкі» — трэцякурсніцы ўніверсітэта. Яны паспрабавалі аб'яднаць рэгіянальныя купальскія адметнасці ў адну завершаную кампазіцыю. З абыходам двароў (на брэсцкі манер) і жыта (на магілёўскі), выбіраннем Купалінкі і гульнёй з вянкамі, здабываннем агню і распальваннем вогнішча. А яшчэ «прыгатаваннем крупніку» і «спальваннем ведзьмы і старых рэчаў на вогнішчы». У кожнага з гэтых абрадавых дзеянняў ёсць сваё прачытанне і глыбінны сэнс. Напрыклад, спальванне «ведзьмы» сімвалізуе перамогу добрага над злым, а спальванне старых рэчаў — абнаўленне жыцця.

Калі ж дзяўчаты сталі кідаць праз вогнішча свае вянкі, а хлопцы, насупраць, лавіць іх, дык гэта, аказваецца, спосаб больш дакладнага гадання, чым агульнавядомае пусканне вянкоў па вадзе. Бо гэткім чынам можна было не толькі вызначыць месца жыхарства будучага абранніка, але і яго самога.



УДЗЕЛЬНІКАМ музейнага Купалля (а яно ладзілася, найперш, для жыхароў сталіцы) аказалася замала вадзіць карагоды і спрабаваць сябе ў ролі выканальнікаў песеннай аўтэнтыкі. Яны «тэсціравалі» свае здольнасці ў пераскокванні цераз вогнішча і танцорскі спрыт пад традыцыйную дударскую музыку ў жывым выкананні. Колькі дзён ужо мінула пасля купальскіх забаў і гульняў каля Менкі, а быццам і цяпер чую тую музыку:

*«Я цяцерку пасу.*
*Ды ух я!*
*На зялёным лугу.*
*Ды ух я!*
*А цяцерка пад мост.*
*Ды ух я!*
*Я цяцерку за хвост.*
*Ды ух я!..»*

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Мінскі раён.*